✓З **1 верасня** Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прапануе наведвальнікам пазнаёміцца з узорамі мінскага кнігавыдання XIX – пачатку XX ст. у тэматычным раздзеле выставы **«100 рарытэтаў: ад гістарычных кнігазбораў да сучасных арт-кніг»**. Перыяд XIX – пачатку XX ст. стаў часам актыўнага развіцця прыватных, грамадскіх і дзяржаўных выдавецтваў горада. З друку выйшла больш за 3000 выданняў афіцыйнага, рэлігійнага, даведачнага, навуковага, вытворчага і вучэбнага кірункаў. Сярод экспанатаў – асобнікі з прыватных друкарняў Е. Дворца, Я. Грынблата, Б. Саламонава, Н. Нахумава, І. Каплана, шэраг выданняў з асноўнага дзяржаўнага выдавецтва – Мінскай губернскай друкарні, а таксама з Мінскага губернскага статыстычнага камітэта і ўпраўлення Лібава-Роменскай чыгункі. Дэманструюцца творы мастацкай літаратуры, кнігі для дзяцей, зборы дакументаў і статыстычных звестак, гістарычныя нарысы, лекцыі, паштоўкі і інш.

Выстава працуе па 30 верасня.